


# Emmaus

Бюлетэнь рымска-каталіцкай парафіі
Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі
№ 20-2014, 29.06.2014
PDF–архіў на сайце **www.kasciol.by**


**Роздум:**

# Як размаўляць з дзецьмі пра Бога?

## Калі варта распачаць духоўнае выхаванне?



Ёсць такі жарт, што пачынаць выхаванне дзіцяці трэба за 9 месяцаў да нараджэння яго маці: такім чынам спачатку выхаваецца мама, а потым яна выхавае дзіцятка.

Можна сказаць, што гэта, канечне, нейкая ідэальная сітуацыя, але мне падаецца, што мы можам казаць аб духоўным выхаванні дзіцятка ўжо ад моманту, калі яно з'яўляецца пад сэрцам маці.

Пытанне толькі ў форме гэтага выхавання: зразумела, што яно будзе ўскосным. Але калі мама ўдзельнічае ў святой Імшы, прымае Цела Хрыста, спавядаецца — праз гэта яна больш адкрываецца на Божую ласку ў выхаванні дзіцяці. Потым, з нараджэннем і ўзрастаннем дзіцятка, выхаванне прыме больш непасрэдныя формы.

**Некаторыя дарослыя лічаць, што духоўнае выхаванне лепш распачаць з жэстаў і рытуалаў. Ці правільна гэта?**



Часткова я з гэтым згодна. Маленькае дзіця не разумее, хто такі Бог, чаму трэба Яму пакланяцца і г.д. Таму можна навучыць дзіця, напрыклад, знаку крыжа, а пазней і простым малітвам. Зразумела, што спачатку малітва будзе для яго недзе ў адным шэрагу з іншымі вершыкамі, якія яно запамінае, але разуменне прыйдзе пазней.
Справа навучання пойдзе значна прасцей, калі дзіця будзе часта чуць малітвы ці бачыць, як бацькі робяць знак крыжа дома. Тады гэта будзе проста справа падражання, капіравання дарослых, і стане ўспрымацца як нешта натуральнае.

Іншая справа, калі навучанне дзіцяці жэстам і рытуалам становіцца самамэтай. Мне падаецца, што асабліва гэта характэрна для старэйшага пакалення.



Нашыя дзядулі і бабулі, выхаваныя ў строгасці, часта злуюцца і нават караюць яшчэ зусім маленькіх дзяцей, калі тыя няспрытна робяць знак крыжа ці непрыгожа кленчаць пры ўваходзе ў святыню. Зразумела, што трэба ўлічваць магчымасці дзіцяці ў той ці іншы перыяд, і не забывацца, што гэта толькі дзіця.

Паводле: Наталля Станкевіч, Святлана Жылевіч, http://catholic.by
Працяг у наступным нумары.

**Урачыстасць св. Пятра і св. Паўла, Апосталаў**

На гэтым тыдні расклад багаслужэнняў будзе наступны:

- у панядзелак, аўторак, сераду, чацвер, суботу - святая Імша ў 18.00
- у пятніцу, суботу – святая Імша у 10.00
- у нядзелю – святая Імша ў 10.00 і 16.00

у літургіі успамінаем:

- 2 ліпеня (серада) **Урачыстасць Найсвяцейшай Панны Марыі Будслаўскай** – апякункі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі
- 3 ліпеня (чацверг) **Свята св. Тамаша.** Святы Тамаш, празваны Дыдым (блізня), да паклікання ў супольнасць апосталаў быў рыбаком у Галілеі. Калі Езус у дзень уваскрасення з'явіўся апосталам, Тамаша сярод іх не было. Тамаш спачатку не паверыў у змёртвыхпаўстанне, а таму яго часта называюць «няверуючы Тамаш». Пасля ўнебаўзяцця Хрыста апостал накіраваўся на місію ў Персію і Індыю, дзе, паводле падання, сустрэўся з трыма каралямі, ахрысціў іх і прызначыў біскупамі. Каля 72 г. прыняў мучаніцкую смерць у Індыі: быў забіты паганамі мячом або дзідаю. Лічыцца апекуном горада Рыгі, а таксама архітэктараў, будаўнікоў і геолагаў. Яго заступніцтва просяць, молячыся за шчаслівае сужэнства.

у панядзелак, **30 чэрвеня, запрашаем мужчын на сумесную працу каля будучай капліцы** – трэба зняць кастрыцу з даху.

на гэтым тыдні прыпадаюць – **першы чацвер, пятніца і субота месяца** – падчас, якіх мы молімся. У чацверг – дзень малітваў аб паклікаННЯХ да службы Божай. Пятніца – дзень малітваў да Сэрца Пана Езуса. Субота – дзень малітваў праз Найсвяцейшую Дзеву Марыю.

Дзякую Вам, дарагія браты і сёстры, за супольную малітву. Няхай Добры Бог узнагародзіць вашую шчодрасць і дабрыню. Добрага перажывання нядзелі і плённых дзён працы.

тэл: **8-029-880-99-19** (*кс. Андрэй*)

# Мц 16, 13–19



*Ты — Пётр, і дам табе ключы Валадарства Нябеснага*

**У тыя дні: Прыйшоў Езус у межы Цэзарэі Філіпавай і пытаўся ў вучняў сваіх, кажучы: Кім людзі лічаць Сына Чалавечага? Яны ж сказалі: Адны — Янам Хрысціцелем, другія ж — Іллёю, а іншыя — Ераміяй ці адным з прарокаў. Ён кажа ім: А вы кім лічыце Мяне? Сымон Пётр адказаў: Ты — Хрыстус, Сын Бога Жывога. Тады Езус сказаў яму ў адказ: Шчаслівы ты, Сымоне, сын Ёнавы, бо не цела і кроў адкрылі табе гэта, але Айцец Мой, які ў нябёсах. І Я кажу табе, што ты — Пётр (скала), і на гэтай скале Я пабудую Касцёл Мой, і брамы пякельныя не перамогуць яго. І дам табе ключы Валадарства Нябеснага, і што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана ў небе, а што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана ў небе.**

Гэта слова Пана.

*Кім Вы лічыце Мяне? – інакш кажучы – Хто Я для Вас?.. Хрыстос задае канкрэтнае пытанне, на якое неабходна даць канкрэтны адказ… Праблема ў тым, што адказ на дадзенае пытанне не знойдзеш ні ў кніжках па багаслоўі, ні ў каталіцкіх часопісах… Адказ трэба шукаць у сэрцы…*

*І, канешне, недастаткова толькі адказаць, але трэба пацвердзіць жыццём свой выбар…*

2014 © **Рымска-каталіцкая парафія Маці Божай Бялыніцкай г. Горкі**